

*Былая вотчына Сапегаў, свабодны край!*
*Міхась Райчонак*

# *Бацькаўшчына*

**№6 чэрвень 2011 г.**

**Выданне культурна-асветніцкага цэнтра імя Язэпа Драздовіча**
**і Шаркоўшчынскай раённай арганізацыі ГА**
**«Таварыства беларускай мовы імя Францыска Скарыны»**

# Беразвецкую трагедыю нельга замоўчваць

**У гэтым годзе спаўняецца ўжо 70 гадоў з той страшнай даты, калі 26 чэрвеня 1941 года пад Улай энкавэдзістамі была расстраляная калона вязняў Беразвецкай турмы. Мінула ўжо столькі часу, але і зараз пра гэту трагедыю немагчыма чытаць без болі, немагчыма падабраць словы, каб выразіць усе тыя пакуты, праз якія прайшлі гэтыя людзі.**

Людзі, уся віна якіх была ў тым, што хтосьці быў бацькам лесніка, хтосьці мужам настаўніцы, хтосьці служыў паліцыянтам, пракурорам, леснікам...

Вынішчалася эліта, прычым эліта не толькі польская, але і беларуская. Бо тыя людзі, што загінулі, нарадзіліся і жылі тут, на нашай зямлі. Як грамадзяне польскай дзяржавы, яны служылі гэтай дзяржаве. Дык няўжо толькі за гэта яны заслужылі смерці?

Цяперашняе кіраўніцтва Польшчы і польскі народ шмат робіць для таго, каб ушанаваць памяць пра сваіх загінулых грамадзян. Беларускае ж кіраўніцтва стараецца замоўчваць гэтую трагедыю, робіць выгляд, што нічога не адбылося. Але ж тут загінулі нашыя землякі!

Мінулая вайна нашымі ўладамі і зараз падаецца чамусьці ў чорна-белым свеце, маўляў, былі ворагі-немцы і свае, г. зн. прадстаўнікі бальшавіцкай улады. Усе астатнія, што не ўкладаюцца ў гэтую схему, здраднікі і ворагі. Але ж чамусьці не надаецца ўвагі таму, што менавіта жорсткае стаўленне савецкай улады да жыхароў Заходняй Беларусі было прычынай таго, што шмат хто пайшоў на службу да немцаў.

Я не хачу апраўдваць ні немцаў, ні тых, хто ім служыў. Вядома, немцы дзейнічалі як акупанты. Але ж як апраўдаць паводзіны тых, хто і цяпер называе сябе нашымі вызваліцелямі?!

Гэты выпуск «Бацькаўшчыны» мы цалкам прысвячаем гадавіне Беразвецкай трагедыі, пра гэта трэба памятаць, каб такія падзеі больш ніколі не паўтараліся на нашай зямлі.

**Вечная памяць загінулым!**



**Помнік загінулым на Усходзе ў Варшаве**

# Беразвечча –

*Успомнім усіх паімённа,*
*Горам успомнім сваім.*
*Гэта трэба не мёртвым,*
*Гэта трэба жывым.*
***Р. Раждзественскі***

**Польскі штогоднік ,, Rocznik Parafii Swetego Krzyza" за 1991–92 і 1992–93 гады падводзіць вынікі пяцігадовых пошукаў ахвяр Беразвечча (гэтай беларускай Катыні). Паведамляецца, што 13 красавіка 1991 года адбылася ўрачыстая Імша ў Беразвеччы па бязвінна закатаваных суайчынніках. А потым такое ж ушанаванне ахвяр НКВД адбылося ў вёсцы Мікалаева каля Улы (Бешанковіцкі раён). На тэрыторыі Усходніх Крэсаў, аккупаваных СССР, у 1939 годзе было арганізавана каля 200 турмаў, якія сталі месцам дзікіх злачынстваў над людзьмі. Гэтыя факты 50 гадоў пакрываліся ганебным маўчаннем савецкіх уладаў. І толькі ў нядаўнія гады сталі прызнанымі...**

Адным з такіх жудасных месцаў стаў будынак былога кляштара базыльянаў у Беразвеччы. Немагчыма апісаць зверствы функцыянераў НКВД. У людзей, якія цудам ацалелі, адно ўпамінанне аб Беразвеччы прыводзіць іх у жах. Тут замучаны насмерць каля 1000 чалавек. А з пачаткам нямецка-савецкай вайны пры спешнай эвакуацыі НКВД не паспелі замесці сляды. Тут было знойдзена шмат трупаў, павязаных калючым дротам, спешна закапаных на дзядзінцу, або патопленых у кляштарнай студні, частка жыўцом замураваных у камерах. Каго не паспелі забіць, 24 чэрвеня 1941 года спешна пагналі ў бок Віцебска.

Два ці тры дні ішлі без яды і піцця сонечнай спякотай. Ішлі праз Глыбокае, Кавалі, Галубічы, Ушачы, Сарочын, Бальбінава, Капусьціна. Дарога была ўслана трупамі – тых, хто адставаў, таго стралялі або калолі штыкамі. 26 чэрвеня ў Таклінове каля Улы на калону наляцелі нямецкія самалёты. Ратуючыся ад абстрэлу, НКВДысты вырашылі расстраляць усіх вязняў. Толькі некалькім чалавекам удалося ўцячы ў лес і ўратавацца.

Некалькі тысяч нашых суайчыннікаў з Шаркаўшчыны, Браслава, Дзісны, Глыбокага і ваколіц загінулі тут. Сярод іх былі настаўнікі, лекары, ксянзы, манахі, афіцэры, музыкі, артысты, інжынеры,сяляне, рабочыя. Калгаснікам загадалі звезці забітых да бліжэйшага лесу, дзе знаходзіліся вялізныя доўгія рвы ад капцоў (буртоў) калгаснай бульбы. Там трупы укладвалі роўна з берагамі і засыпалі зямлёй. Некаторыя з забітых мелі пры сабе медалікі, крыжыкі, здымкі сваіх блізкіх... 50 гадоў сваякі не ведалі месца пахавання сваіх кроўных. І вось настаў час праўды аб трагедыі. Гэтага вымагала польская грамадская думка.

Загінуўшыя павінны быць ушанаванымі, акалічнасці іх смерці павінны быць высвеценыя. Да шанавання ахвяр Катыні, Асташкава, Старабельска далучаецца Беразвечча (каля Глыбокага) і Мікалаева (каля Улы).

**Далей прыводзяцца прозвішчы больш за 250 загінуўшых, якія ўдалося ўстанавіць:**

1. Альхімовіч Эдмунд, дырэктар школы з Плісы;
2. Ананіч Адам, загінуў у Беразвеччы;
3. Атрошка Юзаф, служачы з Браслава, загінуў у Беразвеччы;
4. Аукштоль Юзаф, загінуў у Беразвеччы;
5. Болда Антоні, сын Войцеха і Кацярыны,1882 года нараджэння, купец, уласнік гасцініцы ў Браславе, Беразвечча, потым Вілейка(?);
6. Багданёнак Павел Васільевіч, в. Пялікі, Беразвечча, расстраляны пад Улай;
7. Бант Янкель, крамнік з Браслава, загінуў у Беразвеччы;
8. Барэйка Веслаў, 1913 года нараджэння, селянін з Дзеркаўшчыны (Глыбоцкі раён), знік бясследна ў Беразвеччы;
9. Барэйка Канстанцін, 1911 года нараджэння, се-

# дарога смерці

лянін з Дзеркаўшчыны, знік бясследна ў Беразвеччы;
10. Бейнаровіч Юзаф, селянін с. Дварэц;
11. Бароўка Аляксандр, матэматык, Паставы;
12. Барткевіч Леанард, сын Пётры, 1918 года нараджэння, фальварак Шэртыя Пліскай гміны, селянін.
13. Барысовіч ці Барысевіч, Чарневічы, гандляр;
14. Беліцкі, уласнік рэстарану, Паставы;
15. Браун Антоні, селянін з Пруднікава (Пліса);
16. Браун Марцін, 1910 г.н., жанаты, з Пруднікава, селянін;
17. Браун Стэфан, 1915 г.н., сын Яна, жанаты, з Пруднікава;
18. Брынэк Людвіг, сын Вільгельма і Марыі з Васілеўскіх, 1877 г.н., фальварак Любеіс, Свянцяны;
19. Буйка – сяржант, Беразвечча;
20. Булка – радавы, Беразвечча;
21. Бурлук Леапольд, сын Андрэя і Зофіі, 1910 г.н., Браслаў, асуджаны ў Беразвеччы на 8 гадоў, загінуў на "Дарозе смерці";
22. Бучынскі Мар'ян, 45 гадоў, лекар з Ліды, арыштаваны з сям'ёй, загінуў на "Дарозе смерці";
23. Бучэль Браніслаў, 1901 г.н., Паставы, рабочы;
24. Вансовіч, інжынер, Паставы;
25. Вішнеўскі, 40 гадоў, дырэктар школы ў Дзісне, Беразвечча;
26. Вайцяхоўскі, уладальнік аўтамабіля, Паставы;
27. Вайткевіч Францішак, загінуў у Беразвеччы;
28. Вольскі Казімір, настаўнік, Браслаў, Беразвечча;
29. Гардзеёнак, в. Палялейкі, Беразвечча, уцёк з-пад расстрэлу пад Улай;
30. Весна Антоні, ляснік з Падольшчыны Германавіцкай гміны;
31. Гаранін Адам,18 гадоў, фальварак Юзэфова, гміна Тарзянова;
32. Гаранін Францішак, Юзэфова, гміна Параф'янава;
33. Гаранін Юзаф, Юзэфова, гміна Параф'янава;
34. Гаранін Піус, Юзэфова;
35. Глазко Міхал, 21 год, фальварак Латышы, Луж-



Бакавы фасад. Здымак Я. Булгака 1930-х гг. У хуткім часе бальшавікі зробяць тут турму.

каўскай гміны, загінуў у Беразвеччы;

36. Гушча, жанчына з маленькай дачкой;

37. Гушча, лекар, вязень Дзісны і Беразвечча, загінуў на "Дарозе смерці";

38. Габэр Станіслаў, сын Пётры і Анны, 1906 г.н., тэхнік меліярацыі ў Браславе, Беразвечча;

39. Гегель Мікола, з Селязнёва, селянін;

40. Гембіцкі, у Беразвеччы апазнаны сярод трупаў;

41. Глазко Міхал, 21 год, в. Латышы Лужкоўскай гміны, Беразвечча;

42. Гевіс, лекар, Беразвечча;

43. Гоаковіч, начальнік дарожнага аддзела, арыштаваны ў 1940 годзе;

44. Грудзінскі Станіслаў, 1898 г.н., сын Людвіга, в. Кавалеўшчына Глыбоцкай гміны, арыштаваны ў 1939 г., Беразвечча;

45. Грудзінскі, муж настаўніцы;

46. Грышкевіч Ежы, 1903 г.н., в. Стажына Пліскай гміны, Беразвечча, потым Вілейка;

47. Далецкі Ян, 1908 г.н., настаўнік;

48. Дабачэўская Ганна, дачка палкоўніка, студэнтка, Беразвечча;

49. Даманьская Ірэна, жонка капітана, Беразвечча;

50. Дарашчонак Мікалай Лявонавіч, в. Сасноўцы, Беразвечча, на "Дарозе смерці" ранены кінуты ў траншэю, вылез з яе і ўцёк, паступіў у паліцыю, потым выехаў у ЗША;

51. Дэюрэска, дарожны майстар, загінуў на "Дарозе смерці";

52. Добаш, дырэктар гімназіі ў Браславе;

53. Доўбар ці Доўбэрт Браніслаў, м. Горкі, селянін, Беразвечча;

54. Доўбар або Доўбэрт Адольф, м. Горкі, Беразвечча;

55. Дубашынскі Якаў, в.Гарбуны, вывезены ў 1941 годзе;

56. Дубашынская Клаўдзія, в. Гарбуны, вывезена ў 1941 годзе;

57. Дулінец, афіцэр, загінуў на "Дарозе смерці";

58. Ермаковіч Ян, Беразвечча;

59. Ерафееў Сямён, купец, Паставы, арыштаваны 22.06.1941г.;

60. Ерафееў Юльян, купец, Паставы, арыштаваны 22.06. 1941 г.;

61. Жантуан Владэк, (ф. Тарзянова), Беразвечча;

62. Жаркевіч (або Жарневіч) Антоні, служачы ў Браславе, загінуў у Беразвеччы;

63. Жаркевіч (або Жарневіч) Эдвард, студэнт універсітэта ў Вільні, арыштаваны ў Браславе, Беразвечча;

64. Жаль Віцэнты, 1901 г.н., Глыбокае, Беразвечча;

65. Жыліньскі Міхал, паліцыянт з Пастаў, Беразвечча;

66. Завадскі Уладыслаў, загінуў у Беразвеччы;

67. Завадскі Казімір, сын Генрыка, каморнік, Беразвечча;

68. Загурскі, шэраговец, Беразвечча;

69. Здановіч, мернічы, Браслаў, Беразвечча;

70. Звалакоўскі Уладыслаў, інжынер, загінуў у Беразвеччы;

71. Кіраўнік пачатковай школы ў Ёдах, потым жыхар в.Мількі, загінуў пад Улай;

72. Ігнатовіч Адам, Глыбокае, загінуў у Беразвеччы;

73. Ізберскі Альбін, адвакат, Паставы, арыштаваны 22.06.1941 г.;

74. Калінскі Ігнацы,1905 г.н., жанаты, селянін, фальварак Шарстні Пліскай гміны, арыштаваны ў 1940 г.;

75. Карбоўнічак Ян Сцяпанавіч, 1895 г.н., сын Станіслава і Мар'яны, настаўнік, в. Антасіта, з гміны Дрысвяты, Беразвечча;

76. Карчэўскі Ян, 1895 г.н., сын Антона і Вікторыі, жанаты, ф. Жараў Пліскай гміны, арыштаваны ў 1940 годзе;

77. Карчэўскі Кароль, 1916 г.н., сын Зігфрыда і Анелі, не жанаты, селянін, ф. Кучыньшчына Пліскай гміны, арыштаваны ў 1940 годзе;

78. Карчэўскі Станіслаў, 1900 г.н., сын Юльяна, не жанаты, ф. Жараў Пліскай гміны, арыштаваны ў 1940 годзе;

79. Качан, афіцэр, загінуў на "Дарозе смерці" каля Улы;

80. Катовіч Васіль Лукіч, в. Каўшэлева, капрал, Катынь, уцёк;

81. Каркоцкі Францішак (стары), Беразвечча;

82. Каркоцкі Мечыслаў, селянін в. Купеле, Беразвечча;

83. Каравай Мечыслаў, сын Фелікса і Алаізы з Врублеўскіх, 1889 г.н., в. Масальшчына Браслаўскага павету, масажыст, Беразвечча;

84. Клімовіч Генрык, натарыус, Браслаў, там і забіты;

85. Капцінскі Здзіслаў Кароль, 1903 г.н., сын Францішка і Ганны, дырэктар пачатковай школы ў Глыбокім, загінуў у Беразвеччы;

86. Казлоўскі Юзаф, кадэт, Дзісненскі павет, арыштаваны ў 1939 годзе;

87. Квапінскі Лявон, арыштаваны ў 1939 годзе ў Глыбокім;

88. Крулікоўскі, Глыбокае, загінуў у Беразвеччы;

89. Крэміс Павел, солтыс, замураваны жывым у Беразвеччы;

90. Котліцкі Мечыслаў, асаднік, закончыў Віленскі універсітэт, Беразвечча;

91. Кудзін Мечыслаў, селянін, в.Пашукі, Беразвечча;

92. Кульваноўскі Аляксандр, гаспадар крамы ў Галубічах, загінуў пад Улай;

93. Кунцэвіч Ігнат Восіпавіч, 1902 г.н., в. Снегі, загінуў на “Дарозе смерці” пад Улай;

94. Кур’яновіч Ян, 1907 г.н., в. Солонэ, арыштаваны ў 1939 годзе;

95. Кухарскі, бурмістр, Дзісна, Беразвечча;

96. Лапацкі Юзаф, в. Шылкі, Германавіцкай гміны, арыштаваны ў 1940 годзе;

97. Ластаўка Ян, в. Шылкі Германавіцкай гміны, арыштаваны ў 1940 годзе;

98. Ласоўскі, сержант (Шаркаўшчына?), загінуў пад Улай;

99. Літоўчык Сяргей, электрык, Браслаў, загінуў у Беразвеччы;

100. Ліхаўскі Казімір, сын Богуміла і Марыі, загінуў у Беразвеччы;

101. Люба (яўрэйка);

102. Латышонак Іосіф Лявонавіч, в. Дубавое, 1893 г.н., Беразвечча, загінуў у Мікалаеве каля Улы 26 чэрвеня 1941 года *(Латышонак Канстанцін Лявонавіч г.п. Шаркаўшчына (1899–1919), з 1918 года служыў у Чырвонай Арміі, загінуў на Украіне; Латышонак Іван Лявонавіч, Дубавое, 1877 г.н., з 1918 года ў Чырвонай Арміі, расстраляны ў 1937 годзе)*;

103. Макавецкая (матка), м. Смейна, Беразвечча;

104. Макавецкая Крыстына (дачка), м. Смейна, Беразвечча;

105. Малей Ян, Беразвечча;

106. Малей Павел, Беразвечча;

107. Малей Зыгфрыд, перанёс усе катаванні, але невядома, ці застаўся жывы;

108. Марчэўскі, школьны інспектар, Браслаў, Беразвечча;

109. Матошка Міхал, Беразвечча;

110. Мазур Францішак, 1896 г.н., паліцыянт, асаднік, в. Мілашова, Беразвечча;

111. Мілевіч Мікола, 1912 г.н., сын Мікадэма і Канстанцыі з Пасюкевічаў, закончыў тэхнічную школу геадэзіі ў Вільні, памёр у Беразвеччы падчас следства;

112. Мяховіч Ян, сын Яна і Анэлі, 1910 г.н., в. Альховікі, павет Дзісненскі, Беразвечча;

113. Міхайлоўскі Уладзімір, вучань гімназіі;

114. Міхайлоўскі Эдмунд, сын Уладзіслава і Марыі з Цыбульскіх, ф. Зацішша каля Глыбокага, 20 год, кавалерыў у Паставах, Беразвечча;

115. Міхайлаў Мікола, савецкі лётчык, Беразвечча;

116. Мільчонак, афіцэр, загінуў на “Дарозе смерці”;

117. Монтыгерд-Лайба Ежы, сын Яўгенія і Вінцэнты з Дваякоўскіх, 1917 г.н., ст. харунжы, Беразвечча;

118. Мароз, лекар, Паставы, арыштаваны 22.06 1941 г.;

119. Мароз Віктар, тэолаг, в. Дэмбоўка (Дубаўка), каля Друі, арыштаваны 20.06. 1941 г.;

120. Мароз, лекар, Паставы, арыштаваны 22.06. 1941 г.;

121. Мурашоў Яўген, гаспадар маёнтку Курылавічы, гміны Язна, скончыў жыццё самазабойствам у Беразвеччы;

123. Мядзведскі Кузьма Адамавіч (1899–1941), г.п. Шаркаўшчына, арыштаваны 20.06.1941г., загінуў на “Дарозе смерці” каля Улы;

124. Мядзведскі Дзмітры Адамавіч(1903–1941), арыштаваны 20.06.1941г., загінуў каля в. Мікалаева бліз Улы;

125. Мядзведскі Лявон Адамавіч (1905–1941), арыштаваны 20.06.1941 г., загінуў у Мікалаеве каля Улы, Шумілінскі раён, усе сем’і Мядзведскіх вывезены ў Сібір;

126. Невяровіч Лявон, 1883 г.н., кіраўнік экспэрментальнай льняной станцыі ў Беразвеччы, загінуў каля Улы;

127. Немчыновіч, рэферэнт карных спраў, Паставы;

128. Носка, г.п. Шаркаўшчына, сяржант, загінуў каля Улы;

129. Огоноўскі (Аганоўскі), геадэзіст, Паставы, Беразвечча;

130. Окуліч (Акуліч), пракурор, Паставы, Беразвечча;

131. Окошка (Акошка), селянін, Паставы, Беразвечча;

132. Олаховіч (Алаховіч) Анзэльм, сын Юзафа і Тэклі, кавалер,1905 г.н., селянін, ф. Чэрстне, гміна Пліса;

133. Овчарскі (Аўчарскі) Томаш, настаўнік, Браслаў, Беразвечча;
134. Палушка Станіслаў, 1899г.н., настаўнік гімназіі ў Дзісне, Беразвечча. Уратаваўся, але ўжо памёр.
135. Паўлюць Аляксандр, 1894 г., сын Леапольда, Маладзечна, арыштаваны ў Ашмянах;
136. Петрыкоўская, дырэктар школы, Беразвечча;
137. Пехаўскі Алёйза, сын Пётры, 1918 г.;
138. Платнік, сяржант, загінуў на "Дарозе сьмерці";
139. Плавінскі Браніслаў, селянін, Багушэвічы, Беразвечча;
140. Пажэцкі, служачы дома графа Пжэсдзецкага, Паставы;
141. Пронька, (стары), Беразвечча;
142. Працэвіч(?) Багдан (пенсіянер), Беразвечча;
143. Пуцята, бурмістр Дзісны, Беразвечча; вазілі ў клетцы па ваколіцах Полацка як польскага "панакравапіўцу";
144. Пухальскі, служачы, Пліса, Беразвечча;
145. Пупін Станіслаў, сын Пётры і Альжбеты з Нарушэвічаў, 1915 г.н., гміна Левонпаль, арыштаваны 22.06.1941 года, Беразвечча;
146. Пушка Станіслаў, селянін мястэчка Ліставатка, гміна Браслаў;
147. Пячонка Якаў Аляксандравіч, 1898 г.н., в. Багута, гміна Шаркаўшчына, загінуў у Беразвеччы;
148. Пячонка Віталь Якубавіч, в. Казінец Шаркаўшчынскай гміны,выселены ў 1940 годзе, з 1941 г. ў арміі Андэрса, потым з'ехаў у ЗША;
149. Пячонка Рэня Якубаўна, у 1940 годзе вывезена ў Сібір, дзе і памёрла;
150. Пячонка Люба, жонка Якуба, вывезена ў Сібір, выжыла, выехала ў Польшчу;
151. Пташнік, Шаркаўшчына, гандляр, Беразвечча, уцёк з-пад расстрэлу ў Мікалаеве каля Улы;
152. Пяткевіч Ілля Напалеонавіч, 1886 г.н., в. Свілы Дзісненскага павету, жыў у Томску, арыштаваны ў 1938 годзе, расстраляны (Мартыралог "Руні"ад 31.05.2004 г.);
153. Раевіч Рышард, сын Францішка і Адэлі з Руткоўскіх, 1872 г.н., м. Новы Явар, гміна Мёры, селянін, Беразвечча (не меў пальца і рукі);
154. Раксімовіч Леанард, сын Рамуальда і Ядвігі з Пяткевічаў, 1902 г.н., мернічы ў Дзісне, Беразвечча;
155. Раманоўскі Пётра, Беразвечча;
156. Ралько Пётра, сын Антона і Малгажаты з Маёраўскіх, 1889 г.н., Сорнава Гара, 24.04.1941 г., эвакуіраваны з Беразвечча;
157. Раманас (стары), адвакат з Браслава, Беразвечча;
158. Рубашка Мікола, 1909 г.н., жыхар Германавіч Дзісненскага павету, Беразвечча;
159. Рудніцкі Ян, 1900 г.н., дырэктар школы ў Шаркаўшчыне, арыштаваны 07.04. 1940 года, Беразвечча, потым Ухта Комі АССР;
160. Рудоміна-Дусяцкі Францішак, 1895 г.н., сын Канстанціна і Марыі, селянін, Якузева Дзісненскага павету, Беразвечча;
161. Рудоміна-Дусяцкая Марыя, 1875 г.н., маці Францішка, в. Сарокі Дзісненскага павету, Беразвечча, загінула ў сакавіку 1941 года;
162. Рудоміна-Дусяцкі Вацлаў, 1892 г.н., сын Канстанціна і Марыі, Сарокі, архітэктар і земляроб, Беразвечча;
163. Рудоміна-Дусяцкі Вітольд, 1892 г.н., арыштаваны ў снежні 1940 г., Беразвечча, вывезены ў Комі АССР, там і загінуў;
164. Рулка Францішак, 1897 г.н., сын Паўла, служачы з Браслава, загінуў у Беразвеччы;
165. Сінскі Антоні;
166. Руткевіч Мечыслаў, 1890 г.н., Глыбокае, арыштаваны 22.06.1941 г.;
167. Рыбчыньскі;
168. Рымбід-Міцкевіч Рышард , 1902 г.н., настаўнік, Браслаў, Беразвечча;
169. Рыхтэр Конрад, сын Марыі з Свентахоўскіх, гміны Мікалаева, інжынер-санітар,каля Улы прабіты штыком;
170. Садоўскі Мітрафан, 04.06.1904 г.н., в. Ліпаціна гміны Мікалаева каля Дзісны, Беразвечча, Ворша, лагер на Поўначы, дзе і загінуў; сям'я вывезена ў Казахстан, выжыў толькі сын, цяпер у Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліцы, міліянер;
171. Сальмановіч Юзаф, сын Зыгмонта і Канстанцыі Грамадскай, 1879 г.н., м Падзісне гміна Відзы, працаваў на сельскай гаспадарцы, закончыў сельскагаспадарчую акадэмію, Беразвечча;
172. Сальмановіч Лявон, сын Юзафа і Ганны, 1906 г.н., Падзісне, закончыў Львоўскі палітэхнікум, інжынер-лесавод, Беразвечча;
173. Сенкевіч, селянін, м. Горкі, Беразвечча;
174. Серпуць Пётра, Бе-

развечча;

175. Сарока, селянін, Паставы, Беразвечча;

176. Сататовіч Баляслаў, бухгалтар графа Пршэсдзецкага, Паставы, арыштаваны 22.06.1941г.;

177. Сангайла, служачы ашчаднай касы ў Паставах, арыштаваны 22.06.1941г.;

178. Сенькоўскі Станіслаў, 1897 г.н., з Пецербурга, інжынер у Глыбокім;

179. Скіндэр Уладзіслаў, 1896 г.н., афіцэр, в. Станішча Пастаўскага павету, Беразвечча;

180. Скур'ят Адольф, забіты ў Беразвеччы ў 1941 годзе;

181. Скібскі Ян, 35 гадоў, Глыбокае, Беразвечча;

182. Скібла Пётра, селянін 1914 г.н., Замошша, гміна Ёды, арыштаваны 20.06. 1941 г., Беразвечча;

183. Следзеўскі Францішак, селянін, м. Горкі, Беразвечча;

184. Следзінскі, Беразвечча;

185. Славецкі Станіслаў, 1920 г.н., вучань, Беразвечча;

186. Спальтабака Станіслаў, 1903 г.н., начальнік пошты ў Плісе, арыштаваны 22.06.1941 г., загінуў каля Улы;

187. Станкевіч Базыль, 1911 г.н., паліцыянт у Галубічах, арыштаваны 22.06. 1941 г.;

188. Станкевіч, уласнік ф. Барок каля Беразвечча;

189. Сташкевіч Цімафей, замучаны ў Беразвеччы (замураваны);

190. Сурвіла, матэматык з Пастаў, арыштаваны 22.06.1941 г.;

191. Свароўскі Уладзіслаў, дырэктар школы ў Галубічах, арыштаваны 22.06.1941 г.;

192. Сырэвіч Юстын, таварыства каталіцкай моладзі ў Дзісне, Беразвечча, выскачыў з трэцяга паверху, застаўся калекам, сасланы ў лагер між Ухтой і Варкутой, застаўся жывым;

193. Сухаверскі Эдвард Антонавіч, 1895 г.н., жанаты, в. Густаты Ёдскай гміны, паляк, з сялян, арыштаваны 24.06.1941 г., загінуў пад Улай;

194. Ткач Пётр, кравец, в.Гарнастаі, Беразвечча;

195. Тытус (Ціт), 32 гады, памочнік папа, в. Ластавічы, Беразвечча;

196. Такушэвіч Цімафей Пятровіч, 1906 г.н., настаўнік Шаркаўшчынскай школы, асуджаны 13.07. 1940 г. НКУС як "сацыяльна небяспечны элемент", 5 гадоў ППЛ, Севжэлдорлаг; вызвалены для арміі Андэрса ў 1941 годзе;

197. Тамашэўскі Уладзіслаў Уладзіслававіч,1875 г.н., в. Запушчаны Шаркаўшчынскай воласці, паляк, працаваў у сваёй гаспадарцы, замучаны ў Беразвеччы 18.11.1940 года;

198. Тамашэўскі Густаў Уладзіслававіч, 1876 г.н., в. Запушчаны Шаркаўшчынскай воласці, паляк, пражываў у в. Маскалюкі, замучаны ў Беразвеччы 18.11. 1940 г.;

199. Трумпель Эдмунд Рыгоравіч, 1896 г.н., м. Ёды, селянін, трое дзяцей сасланы ў лагер г. Бузулук Чкалаўскай вобласці;

200. Турчынская Алена Станіславаўна, 1887 г.н., в. Казлоўшчына Германавіцкай воласці, за антысавецкую агітацыю 09.07.1940 г. саслана ў Томлаг;

201. Фронэк Францішак, 30 гадоў, інвалід на калясцы, Беразвечча;

202. Фінкельман, гандляр, Беразвечча;

203. Францкевіч Іван Адольфавіч, 1889 г.н., літовец, адукацыя сярэдняя, мешчанін з Шаркаўшчыны, асуджаны 07.09.1940 г., у Цемлагу, вызвалены ў 1941 годзе як польскі грамадзянін, выбыў у Акцюбінск;

204. Фурс Ігнат Ігнатавіч, 1916 г.н., в. Жарствянка, беларус, селянін, адукацыя пачатковая, арыштаваны за нелегальны пераход мяжы, Ужлаг Разанскай вобласці;

205. Хадасевіч, служачы з Плісы;

206. Хармац, солтыс, Браслаў, загінуў у Беразвеччы;

207. Хасіневіч Раман,1919 г.н., загінуў у Беразвеччы;

208. Целяк Аляксандр, тэхнік-будаўнік, Паставы, арыштаваны 22.06.1941 г.;

209. Целяк Уладыслаў, музыка, Паставы, арыштаваны 22.06.1941 г.;

210. Цыбульская Ванда, настаўніца, Дзісна, арыштавана 22.06.1941 г.;

211. Цярэнцеў Нікіфар Фіонавіч, 1918 г.н., в. Варонка, селянін, асуджаны 01.02.1941 г. на 8 гадоў ППЛ, Увдзёльлаг, Нарыльск, вызвалены як польскі грамадзянін, выехаў у Куйбышаў;

212. Цітовіч Іван Рыгоравіч, 1889 г.н, в. Падобы, беларус, з сялян, жыў у Мар'янове, асуджаны 23.07. 1940 г. на 8 гадоў ППЛ, вызвалены 14.11.1941 г. як польскі грамадзянін;

213. Шырын Збігнеў, гаспадар маёнтку Падольшчына, гміна Германавічы, арыштаваны ў 1940 г.;

214. Шыран Усевалад Станіслававіч, лекар, хірург, жыў у Лужках, Беразвечча, загінуў каля Улы;

215. Шчырбула Мар'ян, мастак, закончыў акадэмію ў Кракаве, Парыж, Беразвечча, загінуў на трасе Табольск – Барнаул;

216. Шток Павел, шэраговец, загінуў пад Улай;

217. Шышка, афіцэр, загінуў пад Улай;

218. Шатыбалка Пётр Усцінавіч,1914 г.н., в. Сутэцкая;

219. (Антанова). Беларус, селянін, арыштаваны 21.11.1940г., асуджаны 17.08.1941 г., паўночнаўсходнія лагеры;

220. Шпец Ядвіга, 1926 г.н., в. Корніца, у 1941 годзе вывезена ў Сібір;

221. Чшэмацкі, настаўнік Пялікаўскай, потым Гуркаўскай школ, Беразвечча;

222. Эстрын Сара, загінула ў Беразвеччы;

223. Янкоўскі Фелікс, ф. Юзэфова, гміна Парафіянава;

224. Яноўскі Браніслаў, 1909 г.н., тэхнік-будаўнік у Глыбокім, арыштаваны 04.10.1940 г., ППЛ, памёр у 1957 годзе;

225. Януковіч Антоні, ф. Юзэфова гміны Параф'янава, арыштаваны 20.11.1940 г.;

226. Януковіч Францішак, сын Адама, ф. Юзэфова, гміна Парафіянава, арыштаваны 20.11.1940 г.;

227. Янушкевіч Пётр, 1895 г.н., в. Сабалеўшчына, арыштаваны 09.03.1941 г.;

228. Яцэвіч, суддзя, Дзісна Беразвечча;

229. Яцэвіч Адам Зыгмундавіч, 1903 г.н., акруговы суддзя з Пастаў, арыштаваны ў 1940 годзе, Беразвечча, потым Смаленск;

230. Яцкевіч Марыя, 21 год, арыштавана ў Паставах 22.06.1941 года, Беразвечча, 23.06.1941 г.;

231. Яцкевіч, сястра Марыі, арыштавана 22.06. 1941.г., загінула ў Беразвечччы 23.06.1941 г.;

232. Яцына Уладыслаў, шэраговец з Пастаў, арыштаваны ў верасні 1939 года, Беразвечча;

233. Якубовіч Віктар, сын Казіміра і Францішкі, 1914 г.н., ф. Навіна Дзісненскага павету, Беразвечча;

234. Янкоўскі – маці распазнала сярод трупаў.

## Забітыя ў іншых месцах:

1. Кавальчык Баляслаў, сын Станіслава і Станіславы з Вольфаў, 1899 г.н., сакратар гміны Тэрдынь, забіты старшым лейтанантам Камаровым 18.12.1944 г. ў Сокалаве Падляскім;

2 .Кропельніцкі, арыштаваны ў верасні 1939 года, расстраляны па дарозе ў Стрыю разам з 20 іншымі арыштантамі.

3. Непакульчыцкі Мечыслаў, бурмістр Жураўна, арыштаваны ў верасні 1939 года, расстраляны разам з 20 іншымі арыштаванымі;

4. Вудра, расстраляны 29.10.1939 года ў Струі.

5. Ленткоўскі Аляксандр, сын Андрэя, 1887 г.н., аптэкар у Стэрдыні, расстраляны ў 1939 годзе.

## Прозвішчы невядомыя:

1. Фельчар з Галубічаў, арыштаваны 22.06.1941г.;

2. Дырэктар школы з Празарок, арыштаваны 22.06. 1941 г.;

3. Ксёндз з келлі Кожуха ў Беразвеччы;

4. Ксёнз у карцэры;

5. Настаўніца з Лодзі, хворая, загінула ў Беразвеччы;

6. Паліцыянт з Плісы ці Свілы, арыштаваны 22.06. 1941 г.;

7. Старая "кулачка".

## Дадатак да спіска, падрыхтаванага палякамі:

1. Аляхновіч Мар'ян Віктаравіч, 1904 г.н., м. Ёды, асуджаны 13.04.1940 г., 8 гадоў ППЛ;

2. Атрахімовіч Уладзімір, в. Каралёва, селянін, знік ў Беразвеччы;

3. Аношка Баляслаў Флер'янавіч, 1888 г.н., в. Пятроўшчына, 8 гадоў ППЛ, Казахстан;

4. Андруль Антон Станіслававіч, 1909 г.н., в. Рысевічы Ёдскай воласці, селянін, 8 гадоў ППЛ, Каргопальлаг;

5. Ананіч Іван Дамінікавіч, в. Жданы, 1888 г.н., селянін, працаваў на пошце ў Замошшы, 8 гадоў ППЛ, загінуў у 1943 годзе;

6. Вялічка Іосіф Якаўлевіч, 1895 г.н., загадчык сельпо, хутар Хвастова Шаркаўшчынскай воласці, трое дзяцей, асуджаны 09.07.1940 г., 8 гадоў ППЛ, Бузулук, Севжелдор;

7. Венцкевіч Іосіф Казіміравіч, 1887 г.н., 4 дзяцей, дарожны майстар на станцыі Шаркаўшчына, асуджаны 21.04.1940 г., Цемлаг;

8. Вільскі Іосіф Клеменцьевіч, 1887 г.н., селянін в. Дзіржчы, асуджаны 04.09. 1940 г., Сіблаг, Паўладар;

9. Врублеўскі Вацлаў Казіміравіч, сакратар Язненскай воласці, пражываў у Германавічах, арыштаваны 04.08.1940 г., Ухтажелдорлаг;

10. Грышувка Браніслаў Іванавіч, на рамонце чыгункі, асуджаны 17.05.1940 г., Ухтажелдорлаг, пасля жыў у Самаркандзе;

11. Данусевіч Данат

Дзмітравіч, 1888 г.н., в. Біейкі Ёдскай воласці, селянін, 5 дзяцей, асуджаны 13.07.1940 г.;

12. Дашкевіч Эдуард Уладзіслававіч, в. Лужкі, арыштаваны 23.04.1940 г.;

13. Ёзаніс Альфонс Антонавіч, 1894 г.н., аграном, в. Пашкі, арыштаваны 08.04. 1940 г., Севвостлаг;

14. Жантуан Яўген Мікалаевіч, 1919 г.н., ф. Тарзянова, арыштаваны 07.04.1940 г., Севжелдорлаг, потым жыў у Ферганскай вобласці;

15. Жданаў Георгій Канстанцінавіч, 1902 г.н., м. Шаркаўшчына, сын святара, асуджаны 35.05.1941 г., Севвостлаг;

16. Зінкевіч Аркадзій Пятровіч, 1895 г.н., в. Вытаркі (каля Варонкі), селянін, асуджаны 01.02.1941 г., Варкута;

17. Зінкевіч Войцех Сцяпанавіч, 1916 г.н., в. Дубаўка, селянін, беларус. Расстраляны на "Дарозе сьмерці" каля Улы;

18. Касінскі Юстын Віктаравіч, 1904 г.н., в. Кажанкі, Шаркаўшчынскага р-на, жыў у Ружанполлі, арыштаваны 23.06.1940 г., вывезены ў Омскую вобласць, вызвалены для арміі Андэрса;

19. Козел-Паклаўскі Уладзіслаў Іванавіч, 1866 г.н., в. Аўласы, адукацыя вышэйшая, асуджаны 23.11.1040 г., Краснаярскі край, потым у Паўладарскай вобласці;

20. Канюшэўскі Станіслаў Казіміравіч, 1916 г.н., пекар з м. Шаркаўшчына, арыштаваны 18.06.1941 г., загінуў 29.12.1943 г;

21. Катовіч Іван Іванавіч, 1914 г.н., в. Глінаўка Германавіцкай воласці, беларус, селянін, арыштаваны 12.12.1939 г., Севжелдорлаг, Бузулук;

22. Кац Антон Якубавіч, 1902 г.н., м. Шаркаўшчына, селянін, арыштаваны 06.04.1940 г., Севжелдорлаг, Паўладарскай вобласці;

23. Клундук Альберт Карпавіч, 1916 г.н., начальнік пошты ў Ёдах, асуджаны 28.08.1940 г., Ухціцемлаг, арыштаваны 08.04.1940 г., Севжелдорлаг, потым Бузулук;

24. Кунцэвіч Ігнат Восіпавіч,1902 г.н., в. Снегі, загінуў на "Дарозе смерці" каля Улы;

25. Лабуць Міхаіл Аляксандравіч, 1995 г.н., в. Кажаны Шаркаўшчынскага р-на, селянін, асуджаны 09.01. 1941 г., г. Ухта, вызвалены 11.09.1941 г. як польскі грамадзянін з правам выезду ў г. Бузулук;

26. Лабуць Ігнацы Аляксандравіч,1889 г.н., в. Сівіцкія, асуджаны 09.01. 1940 г.;

27. Лаўрыновіч Юльян Іванавіч, 1888 г.н., в. Снегі, селянін, малапісьменны, арыштаваны 24.11.1940 г., Карлаг;

28. Ліпскі Іван Восіпавіч, 1904 г.н., в. Корніца, арыштаваны 15.111940 г., Севвостлаг, потым Табольск;

29. Мільчэўскі Аўгуст Францавіч, 1890 г., камендант м. Ёды, арыштаваны 11.01.1940 г., Севвостлаг;

30. Пяткевіч Пётр Уладзіміравіч, 1909 г.н., в. Пашкі, адукацыя сярэдняя, дзесятнік дарогі, арыштаваны 08.04.1940 г., Севжелдорлаг, потым Бузулук;

31. Петухоў Меркурый Самсонавіч, 1896 г.н., х. Полава, арыштаваны 20.07. 1940 г., Ухціжымлаг, вызвалены як польскі грамадзянін 27.07.1941 г.;

32. Піліпёнак Іосіф Вікеньцевіч, 1899 г.н., в. Брыцікі, Зімнікі, арыштаваны 21.03.1940 г., 5 гадоў ППЛ;

33. Райчонак Іосіф Максімавіч, 1895 г.н., в. Сямёнавічы, бацька лесніка, арыштавалі ўзімку 1940 г., вывезлі ў Сібір і ў 35-градусны мароз высадзілі разам з малымі дзецьмі ў тайзе. Капалі ямы і хавалі ў іх дзяцей. Пасля вайны з жонкай і дачкой Валяй з'ехаў у Польшу;

34. Райчонак Мікалай Іосіфавіч, 1912 г.н., ляснік, (сын), в. Сямёнавічы, арыштаваны разам з сям'ёй і вывезены ў сібірскую тайгу. Вызвалены як польскі грамадзянін, ваяваў з немцамі ў складзе арміі Людовай, пасля вайны служыў у Варшаве ў ахове ўрадовай да выхаду на пенсію;

35. Райчонак Пётр, 1893 г.н., в. Сямёнавічы, працаваў на лесасплаве. Арыштаваны ўзімку 1940 г. разам з жонкай і двума непоўнагадовымі сынамі. Вывезены ў глухую сібірскую тайгу. Як польскі грамадзянін быў вызвалены, ваяваў у арміі Людовай, потым з сям'ёй жыў ў Польшы, сыны вывучыліся на дактароў;

36. Рудакоўскі Стэфан Францавіч, 1906 г.н., в. Лужкі, арыштаваны 21.03. 1940 г., , Северадзвінск;

37. Рубніковіч Антон Валер'янавіч, 1919 г.н., в. Беляны, арыштаваны 10.05. 1940 г., Ветлаг;

38. Рудзь Іван Іванавіч, 1896 г.н., в. Дубоўка, Пашкі, арыштаваны 09.04.1940 г., Севжелдорлаг, вызвалены як польскі грамадзянін;

39. Ананіч Адам, загінуў у Беразвеччы;

40. Бойнаровіч Юзаф, селянін.

## Зварот
## Да ўладаў польскіх і людзей добрай волі на свеце

У гадавіну трагедыі ў Беразвеччы мы патрабуем:

1. Выяснення ўсёй праўды пра Беразвечча і іншыя мейцы, палітыя польскай крывёю, выяснення ўсіх акалічнасцяў злачынства.

2. Годнага пахавання і ўшанавання месц іх вечнага спачывання, каб над магіламі можна было памаліцца, пакласці кветкі, запаліць свечкі. Кожны мае права на магілы сваіх блізкіх.

3. Ад Ураду СССР патрабуем маральнага задавальнення сем'яў, поўнага выяснення спраў, аб'яўлення спісу з прозвішчамі забітых, раскрыцця злачынстваў, а калі яшчэ жывыя, пакарання вінаватых, не дзеля помствы, а дзеля справядлівасці.

4. Схіляем галавы перад ахвярамі таго забойства, як і перад іншымі мясцінамі падобных трагедый, каб ужо ніколі ў будучыні ніхто не аплакваў сваіх блізкіх.

*Родныя загінуўшых*
*Варшава, 13.04.1951 г.*

***Калі ўважліва прачытаць спісы ахвяр бальшавіцкага генацыду, разумееш, што з вялікай жорскацю зьнішчаліся лепшыя людзі Бацькаўшчыны, яе залаты фонд. І ніхто не панёс пакарання за гэта страшэннае злачынства. Магчыма, некаторыя з забойцаў яшчэ ходзяць па зямлі і расказваюць сваім ўнукам пра свае "гераічныя подзвігі", іх, як герояў, запрашаюць на сустрэчы з моладдзю. І яны "пудраць мазгі" людзям. Але яны адкажуць за свае злачынства, калі не перад людзьмі, так перад богам. Ад яго суда не ўцячэ ніхто.***

***Прачытаўшы гэты артыкул ты, чытач, зразумееш, што прынеслі нам браты з Усходу ў верасні 1939 года.***

***Матэрыял да друку падрыхтаваў Уладзіслаў Ляскоўскі***



Панарама над возерам Падлазна. Паштоўка часоў нямецкай акупацыі, выдадзеная ў серыі 'Krajavidy Bielarusi' паводле здымка Яна Булгака. Апошняя са шматлікіх паштовак Беразвечча, якія выдадзены за перыяд 1910-1944 гг.

# Беразвецкая трагедыя

**Калісьці, яшчэ ў XVII стагоддзі, у Беразвеччы, блізу Глыбокага, быў базыльянскі мужчынскі кляштар. Свой маёнтак для яго падараваў базыльянам мсціслаўскі ваявода Корсак. Пры кляштары дзейнічала школа, у якой выкладалі фізіку, матэматыку, маляванне, французскую і нямецкую мовы. У 1756–1763 гг. на месцы драўляных пабудоваў слынны дойлід Глаўбіц, той самы, што ўзвёў у Полацку Сафійскі сабор у ягоным сучасным выглядзе, пабудаваў у Беразвеччы вельмі прыгожыя, як і ўсё, што ствараў гэты чалавек на нашай зямлі, мураваныя касцёл і кляштар. Пасля скасавання Уніі ўвесь гэты комплекс быў перададзены Праваслаўнай Царкве, а з 1919 г. — рыма-каталікам. Касцёл пачаў насіць імя святых апосталаў Пятра і Паўла.**

**Пасля аб’яднання Беларусі ў 1939 г. у будынку былога кляштара распачала сваю жудасную гісторыю беразвецкая турма, і ў сценах, дзе дагэтуль узносіліся малітвы да Усемагутнага, пралілася кроў нявінных ахвяраў дэспатызму. Спачатку савецкага, потым гітлераўскага. Пра гітлераўскі дэспатызм і бесчалавечнасць мы чыталі і чулі вельмі шмат, у тым ліку і пра беразвецкі. Жыхары Глыбокага штогод збіраюцца ва ўрочышчы Барок, за Беразвеччам, каб ушанаваць памяць ахвяраў фашызму. З часам тут узнік мемарыяльны комплекс, знайшлося месца і крыжам, якія паставілі вернікі. 27 тысяч ахвяраў канцэнтрацыйнага лагеру ваеннапалонных. Асобна — ахвяры Халакосту. Асобна — магіла святароў, сярод якіх і благаслаўлёныя мучанікі Беразвечча Мечыслаў Багаткевіч, Станіслаў Пыртак, Уладзіслаў Мацьковяк...**

Ірына Жарнасек

## Страшнае, жудаснае месца

Але разам з ушанаваннем памяці ахвяраў фашызму неяк нібы неўпрыкмет замоўчвалася яшчэ адна, папярэдняя старонка беразвецкай трагедыі, гісторыя якой распачалася ў Беразвеччы, прайшла пакутлівым шляхам па дарогах Глыбоччыны, Ушаччыны і закончылася за мястэчкам Улай, каля вёскі Мікалаева, страшнай трагедыяй. Пра яе савецкія гісторыкі пераважна маўчалі, а калі і казалі, то як пра «загінуўшых у вайну паляках». Шмат чаго спісваецца на вайну, быццам вайна здольная апраўдаць усялякую бесчалавечнасць. У гэтым жа выпадку разлік быў яшчэ і на тое, што на Беларусі доўгі час каталікі асацыіраваліся з палякамі.



Паштоўка 1930-ых гг. з выданьня У. Уладзімірава. З будынкаў, якія трапілі ў аб'ектыў фотаапарата, захаваўся толькі двухпавярховы корпус інтэрната для манахаў (леваруч ад царквы). Цяпер там - пенітэнцыянарная ўстанова (www.szukamypolski.com)



Сведка трагедыі Яніна Брыцік.

Вязнямі беразвецкай турмы ў 1939 г. сталі жыхары Глыбоччыны, Мёршчыны, Браслаўшчыны, Пастаўшчыны. Сярод іх — сяляне і настаўнікі, рабочыя і медыкі, палонныя жаўнеры Войска Польскага, святары, арганісты, кухаркі святароў, моладзь, якая ў Заходняй Беларусі ўдзельнічала ў розных арганізацыях — палітычных, грамадскіх, рэлігійных. Сярод мясцовых жыхароў папаўзлі страшныя чуткі пра здзекі ды самавольства ў беразвецкай турме, пра смяротныя выпадкі. Страх як прыйшоў у 39-м у Беразвечча, так і надоўга застаўся тут галоўным валадаром. Ён дыктаваў тут сваю волю, бо чым, да прыкладу, як не дыктатам страху, назавеш тое, што маладая жанчына з Глыбоччыны, даведаўшыся ад знаёмых пра смерць свайго мужа-вязня, падкуплівае канваіраў, забірае ягонае знявечанае цела, але вязе яго не на свае вясковыя могілкі, а ўначы хавае на могілках іншай вёскі. Потым, праз гады, над той магілай з'явіцца помнік са словамі: «Будзь воля Твая...»

Страх валадарыў у тых хатах, з якіх ужо кагосьці забралі ў Беразвечча. Страх панаваў над тымі, каго яшчэ не забралі, але ў любую ноч (найчасцей гэта была ноч) маглі забраць. Распавядалі, як з адной вёскі на Мёршчыне за адну ноч вывезлі ўсіх маладых хлопцаў. Людзі шэптам пераказвалі адзін аднаму, што сярод вязняў у Беразвеччы ёсць святары: ксёндз з Ідолты, з Мёраў... Чулі раней, чыталі ў польскіх газетах, што ў Савецкім Саюзе бязбожная ўлада пазачыняла касцёлы ды цэрквы, а святароў ды многіх вернікаў трымала ў турмах, лагерах, на Салавецкіх астравах, у Сібіры. Цяпер жа і ў Заходняй Беларусі пазналі, што такое ваяўнічы атэізм.

З 1939 года ў Еўропе бушавала Другая сусветная вайна. Савецкі Саюз яна пакуль што не закранала, але тут трывала іншая, не менш страшная вайна — супраць уласнага народа.

Надышоў чэрвень 1941-га, і тая вялікая сусветная вайна прыпаўзла таксама на тэрыторыю СССР. Пасля яе з'явіцца шмат кніг, фільмаў пра гэтую вайну. У іх яркімі фарбамі будзе апавядацца пра мужнасць і гераізм савецкіх людзей, пра смелых абаронцаў радзімы. У іх будзе асуджацца пачварны фашызм з усёй ягонай нялюдскасцю і антычалавечнасцю. На гэтым асуджэнні, нянавісці да яго будзе выхоўвацца не адно пакаленне савецкай моладзі. І дзеці, чытаючы тыя кнігі ды гледзячы патрыятычныя фільмы, будуць шкадаваць, што нарадзіліся запозна, што час гераізму мінуўся і яны ўжо не змогуць стаць паўлікамі марозавымі, бо ўжо ліквідаваныя ўсе кулакі, не змогуць стаць маратамі казеямі, бо немцаў ужо даўно перамаглі, не змогуць з тае ж прычыны стаць маладагвардзейцамі альбо

обальскімі падпольшчыкамі, адважнымі партызанамі... А многія, начытаўшыся кніжак пра адважных байцоў «нябачнага фронту», якія ваявалі супраць затоеных хітрых ворагаў, што падрывалі магутнасць вялікай дзяржавы знутры, шкадавалі, што час змяніўся, хітрыя ворагі ўсе выяўленыя і ліквідаваныя, і значыць, не праявіш геройства таксама і на гэтым, нябачным, таямнічым і рамантычным фронце. Калі б юнакі і дзяўчаты, якія марылі пра такое геройства, маглі толькі ўявіць, што хавалася за гэтым паняццем барацьбы з унутранымі ворагамі!.. Калі б толькі яны ведалі пра паток пралітай крыві нявінных ахвяраў таго «нябачнага фронту»! І думаеш цяпер: «А чаму яны гэтага не ведалі? І чаму мы цяпер таксама не ўсё ведаем?» Дзе, у якім горадзе і калі прайшлі суды над тымі, хто чыніў тое беззаконне і праліваў нявінную кроў нават не на варожай тэрыторыі ( хоць нявінная кроў не можа быць апраўданая ні на якой тэрыторыі), а ў сваёй жа краіне? Такія простыя і адначасова такія складаныя гэтыя пытанні. Мабыць, да таго часу, пакуль на іх не адкажам, мы так і не здолеем усвядоміць, якою мы жадаем бачыць будучыню нашых дзяцей.

Але вернемся ў чэрвень 1941-га. Першыя дні вайны, першыя страты, першыя адступленні савецкіх войскаў. Што рабіць з вязнямі беразвецкай турмы? Было вырашана вывезці іх. 24 чэрвеня распачалася гэтая аперацыя. На світанні вязняў вывелі з турмы і вялізнай калонай у атачэнні канваіраў з аўчаркамі пагналі па пыльнай дарозе на ўсход, у напрамку Ушачаў, за якімі быў Віцебск, — туды, відаць, і кіравалі калону, каб вывезці потым углыб СССР: тэрыторыя дзяржавы вялікая, ГУЛАГ у ёй агромністы, усім месца хопіць.

Адзін дзень нялёгкай, спешнай хады, другі... Знясіленыя, згаладнелыя ды схуднелыя вязні пачалі слабнуць, і змучаныя целы, прашытыя кулямі канваіраў, усё больш заставаліся ляжаць у прыдарожных равах. Пазней канваіры пачалі эканоміць патроны і забівалі ахвяраў штыкамі. «Дзе ёсць красак найбольш пры дарозе, там ціхія равы змагароў», — журботна пісала вязень ГУЛАГу, наша незабыўная Ларыса Геніюш. Падарожнікі гэтага страшнага шляху не былі змагарамі. Яны не паспелі імі стаць. Іхні пакутніцкі шлях пралягаў цераз палі і лясы, і найбольш адважныя спрабавалі ўцякаць. Іх даганялі кулі і сабакі.

Вязні слабелі ўсё больш і больш. Начальства канвою пачало аддаваць распараджэнне тамтэйшым сялянам падвозіць прыслаблых вязняў на конях. За журботнай калонай пацягнуліся павозкі...

Жыхар з Ушаччыны Адам Ж. распавядаў, як яму таксама было загадана выехаць на павозцы і заняць месца ў той калоне. 25 чэрвеня ён вёз раненых і саслаблых, сярод якіх яму асабліва запамяталася пракалатая наскрозь штыком прыгожая маладая дзяўчына. Увечары таго ж дня яму дазволілі вярнуцца дахаты, а ягонае месца занялі сяляне з вёсак з-пад Улы. На ўсё жыццё захаваў ён удзячнасць лёсу за тое, што 26 чэрвеня яго ўжо не было сярод падвозчыкаў.

Тагачасная жыхарка вёскі Камачава Яніна Брыцік, якая цяпер жыве ў Мікалаеве, распавядала мне, як 25 чэрвеня яна разам з



Магіла беразвецкіх пакутнікаў у Мікалаеве.

многімі мясцовымі людзьмі працавала на ваенным аэрадроме каля Улы. Ім было загадана забетаніраваць ягоную тэрыторыю. Ішла вайна, а ў Уле яшчэ рыхтаваліся да яе і спешна бетаніравалі аэрадром. Самалёты стаялі, дарэчы, чамусьці ўсе разабраныя, а людзі рыхтавалі для іх узлётную пляцоўку. Працавалі і, вядома, не ведалі, што не спатрэбіцца іхняя праца, бо вайна ішла настолькі імклівa, што так і не паспеюць адрамантаваць тыя самалёты, так і не змогуць яны ўзляцець ды абараняць радзіму.

Хтосьці з тых, што працавалі на аэрадроме, раптам гукнуў:

— Гляньце, нейкія людзі вунь ідуць... Шмат людзей... І... канвой з сабакамі...

— Цюрэмнікі... — выказаў хтосьці здагадку.

Яніна адразу забылася на працу, на небяспеку, на ўсё забылася і пабегла насустрач той калоне, бо з 38-га года марыла, як сустрэне яна некалі свайго тату, забранага НКВД уначы з хаты. Пойдзе па дровы і марыць: «Вось прынясу іх у хату, а дома... тата...». Дык пабегла насустрач вязням, стала пры дарозе, абаперлася на рыдлёўку і застыла — узіралася ў твары, баялася размінуцца з татам.

— А яны ішлі такія змучаныя, твары шэрыя... Ледзьве ногі перастаўлялі, — выцірае слёзы спадарыня Яніна, — хто нёс які клунак на плячах, хто без яго… Не мела з сабою ні кавалачка хлеба, каб падаць каторамy... Стаяла толькі і ўзіралася на іх, і шукала тату...

Ірына Жарнасек. Беразвецкая трагедыяБаялася Яніна размінуцца з татам і не ведала, што ён ужо даўно парыў сырую зямельку, расстраляны як вораг народа ў тым жа 38-м. Праз шмат гадоў яго рэабілітуюць, пра што ёй, ужо ссівелай, паведаміць скупая канцылярская паперка...

Дык не пашанцавала ёй у той дзень, а на наступны дзень дзяўчына зразумела, што ёй нават вельмі пашанцавала, бо яна сустрэла калону вязняў 25-га, калі яны хоць і былі моцна змучаныя, але яшчэ былі жывыя...

Яна не стала сведкай жахлівай трагедыі. А вось трынаццацігадовай Разаліі з Мікалаева не пашанцавала, бо яна падбегла да вязняў на наступны дзень, 26 чэрвеня, калі калона толькі што перайшла мост на Дзвіне і канваіры загадалі ёй спыніцца. Разалія таксама шукала свайго тату, якога таксама вывелі з іхняй хаты ў 37-м. І яна таксама не ведала, што яго ўжо няма на гэтым свеце. Дачка шукала бацьку сярод жывых. Адкуль жа ёй было тады ведаць, што шматлікія ахвяры 37-га года парылі ўжо зямлю ў Курапатах, на Салаўках, у безыменных магілах неабсяжнай краіны, «где так вольно дышит человек»? Дык і пабегла, і застыла пры калоне, ва ўсе вочы ўзіралася на людзей, што прыйшлі невядома адкуль у іхняе Мікалаева і на чыіх тварах была напісана вялікая чалавечая бяда.

Як толькі калону прагналі цераз мост, яго ўзарвалі, а вязням загадалі легчы на зямлю. Некаторыя з іх здагадаліся пра задуманую расправу, кінуліся ўцякаць. Іх даганялі кулі...

У небе над Мікалаевым праляцеў нямецкі самалёт і скінуў за вёскай бомбы. Зямля здрыганулася, у вокнах хатаў пасыпаліся шыбы… А потым зямля і вяскоўцы здрыгануліся ад новага жаху — ад жорсткай расправы людзей са зброяй над безабароннымі. азалія ляжала ў канаве, зацісну ўшы вушы, — дрыжэла ад страху. Над галавой свісталі кулі, стракацелі кулямёты. Крыкі, енкі, плач узвіліся ў неба. Канваіры расстрэльвалі вязняў — іхняя дарога скончылася. Брахалі сабакі, уздоўж калоны бегалі жонкі канваіраў і крычалі мікалаеўцам, каб не баяліся, бо іх, маўляў, ахоўнікі правапарадку не зачэпяць, бо невінаватых яны не страляюць. Чым жа былі вінаватыя тыя, чыя кроў лілася ракою на мікалаеўскую зямлю, ніхто не казаў. На вачах мікалаеўцаў чынілася адно з самых жорсткіх беззаконняў, чынілася вялізнае злачынства.

...Страляніна нарэшце аціхла, толькі зрэдку чуліся цяпер адзінокія стрэлы па тых, хто яшчэ спрабаваў ратавацца ўцёкамі. А на тым месцы, дзе яшчэ нядаўна былі жывыя людзі, цяпер ляжалі мёртвыя альбо раненыя целы вязняў. Канваіры хадзілі цяпер паміж сваімі ахвярамі, штыкамі дабівалі яшчэ жывых, і кроў пырскала ўверх струмянямі ды залівала іх. Кроў сплывала на зямлю, стаяла ў разорах, крывёю былі залітыя ахвяры трагедыі і іхнія каты...

Гаворыць сведка трагедыі Разалія Барысевіч:

— Як жа страшна было!.. Усё ў крыві! Зямля ў крыві,

мёртвыя і жывыя ў крыві!.. Потым у лесе выкапалі ямы, целы вязняў грузілі на брыкі, звозілі ў лес і скідвалі ў тыя ямы. Падвязуць брыку да ямы, абернуць яе... Не дай Бог такое бачыць і перажыць! Мы потым кроў тых пакутнікаў граблямі зграбалі ў канавы. А вада ў сажалцы, у якой мыліся пасля забойства канваіры, была таксама ўся чырвоная. Не вада, а кроў...

Праз 66 гадоў пасля тых жудасных падзей Разалія Барысевіч распавядае мне пра іх і плача. Як плакала заўсёды, успамінаючы той жах. Як плакала па сваім бацьку ў тую ноч, калі яго забрала НКВД, а ён крычаў ім на развітанне: «Дзеткі! Не плачце! Не бойцеся! Я вярнуся! Я ні ў чым не вінаваты!». Як плакала тады, калі доўгімі днямі й начамі чакала яго і калі перастала чакаць, пачуўшы ад суседа, што разам з ім сядзеў у мінскай турме і якому пашчасціла вярнуцца з таго пекла, аповед пра тое, як вывезлі ейнага тату ўначы з турмы на расстрэл. Як плакала тады, калі атрымала дакумент аб пасмяротнай рэабілітацыі мікалаеўскага конюха Людвіка Нічая, ейнага таты.

...Стаім са спадарыняй Разаліяй і яе малодшай дачкой Галяй каля магілы ахвяраў беразвецкай турмы. Помнік на магіле просты, але сваёй сціслай формай кажа так шмат. На адным баку вялізнай магілы — сімвалічная бетонная камера з чорнымі кратамі і подпісам «Беразвечча», ад яе — доўгая бетонная пліта ўздоўж магілы, што сімвалізуе страшны шлях вязняў, і напрыканцы гэтага



Сведка трагедыі Разалія Барысевіч

шляху — высокі крыж. Чытаю пякучыя словы на чорнай шыльдзе пры крыжы па-польску і па-беларуску: «Тут пахаваныя некалькі тысяч палякаў і людзей іншых нацыянальнасцей, вязняў турмы ў Беразвеччы, якія загінулі 26.06.1941 г. у Мікалаеве. Прысвячаецца памяці ўсіх ахвяраў «Смяротнага шляху». Спачывайце ў спакоі».

— Вечны спачын дай ім, Пане... — прашу ў думках Пана Бога.

Тут, у гэтай магіле, ляжыць шмат і маіх землякоў з Глыбоччыны, ляжыць моладзь з Новага Пагосту, ляжаць ксяндзы Станіслаў Эльяш і Францішак Куксевіч... Тут ляжыць шмат добрых людзей, няздзейсненых мараў, нязбытых надзей. Ніхто не ведае дакладна, колькі людзей лягло ў гэтую магілу, колькі забіта па дарозе да яе. Вязень сталінскага ГУЛАГу, мой зямляк з задарожскай парафіі Рафал Плавінскі, які цяпер жыве ў Польшчы, напісаў у сваёй кнізе «У кіпцюрах ГУЛАГу» пра 1773 забітых у Мікалаеве. Гэтую лічбу пачуў ад канваіраў Павел Кожух, які 26 чэрвеня 1941 года ляжаў у Мікалаеве сярод забітых і якому ўдалося выжыць, бо канваіры не прыкмецілі яшчэ жывога чалавека. Тут ляжыць шмат нашых аднаверцаў, католікаў. Таму, здаецца мне, сімвалічна яшчэ і тое, што гэтая трагедыя адбылася блізу Улы, у Мікалаеве, дзе здавён жыло і жыве шмат католікаў. Таму адразу пасля трагедыі і ўвесь гэты час прыходзілі

на магілу вернікі, каб маліцца «Анёл Панскі». Вера тут перадавалася з пакалення ў пакаленне. Не выпадкова ж, калі ў 37-м арыштоўвалі Людвіка Нічая, у ягонай хаце знайшлі Біблію і малітоўнікі, што павялічыла ягоную віну перад бязбожнай уладай. Не выпадкова і тое, што ягоная дачка прыгадвае цяпер як найбольш значную падзею ў сваім жыцці той дзень, калі бацька прывёў іх, семярых сваіх дзяцей, пасля смерці жонкі, а іхняй маці ў касцёл ды паставіў перад алтаром Маці Божай і ксёндз маліўся над імі, аддаючы іх у апеку Маці Божай. Быццам адчуваў ужо тады Людвік Нічай, што іхнім дзецям суджана застацца не толькі без маці, але і без яго, кармільца сям'і.

Гэта ў Мікалаеве магчыма было за адну ноч зрабіць невялікую каплічку на могілках ў надзеі, што можна будзе ў ёй маліцца. Улада спаліла яе. Праз нейкі час на тым жа месцы за адну ноч зноў з'явілася капліца, і зноў гісторыя паўтарылася. Дык пазней не рабілі ўжо больш капліцы, а толькі паставілі невялікі навес, пад які патаемна, цішком збіраліся на малітвы. Не выпадкова, вядома, і тое, што менавіта сюды час ад часу прыязджаў з Рыгі іхні зямляк, таксама вязень сталінскіх лагераў ксёндз Юзаф Барадзюля ды патаемна адпраўляў у хатах святую Імшу, спавядаў людзей, хрысціў... Насуперак усяму нялюдскаму ды жорсткаму яны жадалі жыць з Богам.

У Мікалаеве і Уле і цяпер трывае малітва. У вернутай святыні ў Уле. А ў Мікалаеве ад 90-х гадоў распачалася малітва ў прыгожай капліцы, цяжар узвядзення якой узваліла на свае плечы Разалія Барысевіч. Яе першымі памагатымі былі тыя, хто і раней прыходзіў на малітвы на мясцовыя могілкі ды ў тыя хаты, дзе спыняўся ксёндз Барадзюля.

Штогод 26 чэрвеня, у дзень расстрэлу беразвецкіх вязняў у Мікалаеве, на агульнай магіле нявінных ахвяраў адпраўляецца святая Імша. Сюды прыязджаюць і прыходзяць вернікі з Улы, з суседніх вёсак, прыязджаюць сваякі пакутнікаў, часта бывае пасол Польшчы ў Беларусі. Дзякуючы чалавечнасці тых, хто збярог памяць аб нявінных ахвярах, хто не жадае, каб штосьці падобнае паўтарылася калі-небудзь на нашай зямлі, тут трывае малітва.

*Часопіс "Наша вера",4(42)/2007*



Капліца ў Мікалаеве

Выданне культурна-асветніцкага цэнтра імя Язэпа Драздовіча і Шаркоўшчынскай раённай арганізацыі ГА "Таварыства беларускай мовы імя Францыска Скарыны"

Рэдактар: Ада Райчонак

Вёрстка: Зьміцер Лупач

Адрас рэдакцыі:
211942, вул. Дзерабіна,10
в. Германавічы
Шаркоўшчынскага раёна
Тэл.: 02154-3-91-24

Рэдакцыя можа не падзяляць думкі аўтараў друкаваных матэрыялаў

Надрукавана на абсталяванні сяброў, распаўсюджваецца бясплатна

Наклад 299 асобнікаў